Варта аддаць належнае спецыялістам дамоў і цэнтраў рамёстваў Віцебшчыны: гэта праблема тут не кідаецца ў вочы. Праўда, цалкам пазбегнуць яе не ўдаецца, але, як правіла, самі ж спецыялісты ў большасці выпадкаў добра разумеюць сапраўдную цану такой «творчасці» і апраўдваюцца тым, што дзеці (ды нярэдка і сталыя майстры) хочуць паспрабаваць сябе ў тых відах творчасці, якія бачаць у разнастайных выданнях і сучасных сродках інфармацыі. Некрытычнае ўпрыманне іх як майстрамі, так і спецыялістамі ў галіне культуры, кіраўнікамі і арганізатарамі творчых працэсаў у выніку толькі памнажае негатыў.

Яшчэ адно апраўданне бытавання такой «прадукцыі» – рынкавая кан'юнктура, якая далёка не заўсёды вызначаецца высокім густам і належнымі адносінамі да нацыянальных традыцый. На жаль, відавочная камерцыялізацыя непасрэдным чынам закранае народнае мастацтва і традыцыйныя мастацкія рамёствы. На хвалі сённяшняй цікавасці да гэтай галіны культуры цікавасць да іх пачынаюць выяўляць розныя вытворцы-непрафесіяналы і аматары, якія не з'яўляюцца носьбітамі або пераемнікамі традыцый. Павярхоўна, механічна засвоіўшы некаторыя простыя прыёмы і тэхналогіі таго ці іншага рамяства, яны часта выдаюць сваю прадукцыю за народнае мастацтва. Рынкавая стыхія ставіць сапраўднае народнае мастацтва ў досыць жорсткія ўмовы, яно не заўсёды вытрымлівае канкурэнцыю з нахабным наступленнем базарнага кітча, таннай замежнай масавай прадукцыі. Хоць гэтыя працэсы ў сваёй большасці маюць аб'ектыўны характар, але супрацьстаяць ім усё ж магчыма і неабходна, у прыватнасці, хоць бы ў адносінах дзейнасці дамоў і цэнтраў рамёстваў.

На першы погляд, такая праблема работнікаў гэтых устаноў культуры не павінна хваляваць. Між тым работнікі дамоў і цэнтраў рамёстваў Віцебшчыны (як, зрэшты, і ўсёй Беларусі) скардзяцца, што даведзеныя да іх фінансавыя паказчыкі па рэалізацыі прадукцыі выканаць за кошт толькі традыцыйных вырабаў немагчыма, таму і даводзіцца апускацца да вырабу нетрадыцыйных, а то і ўвогуле антымастацкіх, але запатрабаваных рынкам рэчаў. Адсюль лагічна вынікае адзіная выснова: творчая дзейнасць устаноў культуры, якія займаюцца адраджэннем, развіццём і папулярызацыяй традыцыйнай мастацкай творчасці, не павінна ўключацца ў агульнадзяржаўны фінансавы механізм: у яе іншыя задачы.

Зрэшты, гэта праблема не толькі Віцебскай вобласці. Што ж да агульнага характару і становішча сучаснага народнага мастацтва і мастацкіх рамёстваў у рэгіёне ў цэлым, намаганняў па іх адраджэнні, зберажэнні, уключэнні ў сучасныя культурныя працэсы, то варта прызнаць, што тут робіцца ўсё магчымае, каб гэтая галіна традыцыйнай культуры займала належнае месца ў нацыянальнай культуры Беларусі.

**Шаура Рыгор Фёдаравіч,**
*доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

## ТРАДЫЦЫЙНАЕ НАРОДНАЕ МАСТАЦТВА: ГІСТОРЫКА-ТЭАРЭТЫЧНЫ АСПЕКТ

Народнае мастацтва Беларусі з'яўляецца багатай скарбонкай духоўнай культуры народа. М. Горкі ў свой час пісаў: «Народ не толькі сіла, якая стварае ўсе матэрыяльныя каштоўнасці, ён – адзіная і невычэрпная крыніца каштоўнасцей духоўных, першая па часе, прыгажосці і геніяльнасці, творчасці, філосаф і паэт, які стварыў усе вялікія паэмы, усе трагедыі на зямлі і найвялікшую з іх – гісторыю сусветнай культуры» [2, с. 48].

У Вялікім энцыклапедычным слоўніку даецца наступнае вызначэнне народнага мастацтва: «Народнае мастацтва, фальклор – мастацкая калектыўная творчая дзейнасць працоўнага народа, якая адлюстроўвае яго жыццё, погляды, ідэалы, што ствараюцца народам і якія існуюць у народных масах, паэзія (паданні, песні, казкі, эпас), музыка (песні, інструментальныя найгрышы і п'есы), тэатр

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(драмы, сатырычныя п'есы, тэатр лялек), танец, архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» [1, с. 784].

У мастацтвазнаўчай літаратуры народнае мастацтва разглядаюць як рукатворнае мастацтва, якое ствараецца чалавекам (калектывам) у працэсе мастацка-творчай дзейнасці. Яно характарызуецца ўстойлівымі прыкметамі ў перадачы традыцый і калектыўнага вопыту праз школы, мастацкія каноны і ўзоры, якія захоўваюцца ў працэсе міжпакаленных сувязей і з'яўляюцца выразнікам агульначалавечых эстэтычных, маральных і светапоглядных інтэнцый.

Асаблівае месца ў жыццядзейнасці і духоўнай сферы людзей займала мастацтва, якое стваралася і праяўлялася ў самых разнастайных відах і формах творчай дзейнасці. Неабходныя ў жыцці прадметы рабіліся не толькі зручнымі і прыгожымі, але ў іх укладаўся алегарычны, рэлігійна-містычны і абрадавы змест. Вырабы з дрэва і кавальская справа, ткацтва і вышыўка, дэкаратыўны і станковы жывапіс, ганчарства і кераміка, пляценне з прыродных матэрыялаў і выцінанка былі неаддзельныя ад побыту людзей, выконвалі не толькі ўтылітарна-функцыянальную ролю, але і з'яўляліся прадметамі эстэтычнай арганізацыі асяроддзя, адлюстраваннем поглядаў чалавека на свет, яго веры, надзеі і духоўна-маральных памкненняў.

На працягу доўгага часу да народнага мастацтва была сфакусавана цікавасць даследчыкаў розных галін ведаў. Толькі за апошнія дзесяцігоддзі дастаткова шмат зроблена тэарэтычных абагульненняў па шматлікіх яго пытаннях, асаблівасцях развіцця ў залежнасці ад гістарычных і рэгіянальных умоў існавання. Варта адзначыць, што літаратурныя крыніцы, публікацыі ў часопісах і навуковых зборніках па праблемах традыцыйнага народнага мастацтва досыць шырокія. Яны асвятляюць значнае кола пытанняў, як з эстэтычнага, так і з прыкладнога боку, дзе на канкрэтных прыкладах дзейнасці асобных промыслаў і рамёстваў і індывідуальнай творчасці народных майстроў выяўляюцца асаблівасці народнага мастацтва як часткі агульнай культуры, вызначаюцца яго месца, функцыі і роля ў грамадстве на розных гістарычных этапах развіцця.

Традыцыйныя віды народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва, ткацтва, касцюм, аб'ёмная пластыка, дэкаратыўны роспіс, пляценне з прыродных матэрыялаў знайшлі адлюстраванне ў працах Я.М. Сахуты, М.Ф. Раманюка, В.І. Жука, у публікацыях В.А. Лабачэўскай, А.К. Лявонавай, Л.У. Вакар, Я.Ф. Шунейкі і іншых, што дае магчымасць прасачыць і асэнсаваць асаблівасці развіцця гэтых відаў мастацтва ў часе і прасторы іх існавання і развіцця. Разам з тым сёння ўзнікае неабходнасць больш глыбокага і грунтоўнага даследавання народнага мастацтва з улікам новых навуковых поглядаў, тых фундаментальных абагульненняў, якія зроблены даследчыкамі і спецыялістамі беларускага, расійскага і замежнага мастацтвазнаўства.

На сучасным этапе развіцця культуры традыцыйнае народнае мастацтва часткова адносяць да сферы фальклору, але не да аўтэнтычных, нематэрыяльных формаў народнай культуры, якія захоўваюць найстаражытную культурную памяць, а да пазнейшых слаёў культурнай памяці, якія маюць прамы судотык з «высокай» і «нізавой» культурай. Традыцыйнае мастацтва, якое эстэтызуе і ператварае асяроддзе, нараджалася і стваралася як вынік мэтазгоднасці, рацыянальнасці, духоўнасці рэчаў і гармоніі іх з прыродай і космасам. Яно жыве і развіваецца як самастойная духоўная цэласнасць па асобных законах прыроднага суладдзя. Цэласнасць у дадзеным выпадку маецца на ўвазе як устойлівы і пастаянны пачатак, у якім аб'ядноўваюцца нацыянальныя і агульначалавечыя духоўныя каштоўнасці. У традыцыйным народным мастацтве суб'ектыўнае, індывідуальнае праяўляецца праз школы і пэўныя каноны, выпрацаваныя папярэднімі пакаленнямі. Асноўным стрыжнем яго функцыянавання і развіцця з'яўляюцца традыцыі, калектыўна створаныя вобразы. Народнае мастацтва, як правіла, асацыіруецца з народнымі промысламі і рамёствамі, мастацкай апрацоўкай матэрыялаў і вырабам прадметаў утылітарнага характару. Функцыі карыснасці, эканамічнасці, мэтазгоднасці прадметаў у народным мастацтве цесна злучаліся з духоўнай асновай, глыбокім эстэтычным зместам. Вядомы венгерскі спецыяліст у галіне эстэтыкі Л. Немет адзначаў, што «мастацтва як складовая частка рытуалу арганічна ўваходзіла ў сацыяльную рэчаіснасць, і яго цяжка было ад яе аддзяліць. Паміж прадметамі, сфармаванымі мастацка, і прадметамі, прызначанымі для выканання якой-небудзь практычнай функцыі, не было розніцы таму, што мастацтва прасвечвала паўсядзённую рэчаіснасць, усё грамадскае быццё, у сапраўднасці сфера мастацтва не была адасобленай» [3, с. 109–110]. Менавіта гэта асаблівасць дапамагае народнаму мастацтву захаваць не толькі ўтылітарна-функцыянальнае прызначэнне, але і сваю прыналежнасць да духоўнага баку жыцця. Яго бытавая, практычная сутнасць адлюстроўвае стваральную дзейнасць чалавека, які парадкуе свой побыт неабходнымі, карыснымі і эстэтычна выверанымі рэчамі. Карыснасць рэчаў, функцыянальная зручнасць, мэтазгоднасць у сваёй аснове нясуць і эстэтычнае пачатак.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

Сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя змены, якія адбыліся ў XXI ст. у глабальным маштабе, паспрыялі стварэнню шмат новых разнавіднасцяў і формаў народнай творчасці. Пашырыліся межы творчых праяў народа, з'явіліся новыя вобразы і мастацкія сэнсы, і гэта не магло не адбіцца на развіцці народнага мастацтва на сучасным этапе. Усё гэта сведчыць аб тым, што народнае мастацтва ўяўляе сабой не нязменны, а рухомы арганізм у духоўным жыцці грамадства, які ўзбагачаецца новымі, разнастайнымі мадэлямі і формамі сваіх праяў.

У сваім развіцці народнае мастацтва залежыць ад укладу жыцця людзей, характару часу, навукова-тэхнічнага прагрэсу, стану духоўнай і матэрыяльнай культуры. Кожная эпоха адрозніваецца сваімі поглядамі на эстэтычныя катэгорыі і духоўныя каштоўнасці ў грамадстве. Змена грамадска-эканамічнай фармацыі, сацыяльны і навукова-тэхнічны прагрэс самым непасрэдным чынам уплываюць на стан духоўнай культуры і на развіццё ўсіх відаў мастацтва. Асабліва падатліва да значных змен народнае мастацтва. Параўноўваючы сялянскае мастацтва другой паловы XIX ст. з перыядам яго развіцця 20–30-х гг. XX ст. і больш позняга часу, мы бачым тыя значныя змены, якія былі выкліканы менавіта сацыяльна-культурнымі трансфармацыямі ў грамадстве. Змянілася сацыяльная аснова, на якой існавала і развівалася традыцыйнае народнае мастацтва. Сёння бытавыя прадметы – вопратку, посуд, прадметы працы – выраблае прамысловасць, што выключае неабходнасць ствараць іх чалавеку ў бытавых умовах. З жыцця людзей сыходзіць у мінулае і тая аснова творчасці, якая была звязана з працай над бытавымі ўтылітарна-функцыянальнымі прадметамі і з'яўлялася важнай сферай праявы эстэтычных густаў працоўнага чалавека. Цяпер мы можам гаварыць пра тое, што народнае мастацтва ў значнай ступені адарвалася ад бытавой асновы, набыло характар чыста эстэтычны.

Такім чынам, традыцыйнае народнае (бытавое) мастацтва ўяўляе сабой самастойную цэласнасць грамадска-гістарычнага і духоўнага жыцця народа. Яно развіваецца на асобых законах творчасці, у аснове якіх – калектыўнасць мастацкага свядомасці, сувязь з прыродай, пераемнасць традыцый, выпрацаваных папярэднімі пакаленнямі. Ад іншых формаў культурных утварэнняў яго адрознівае гістарычнасць мастацкай свядомасці, цэласнасць духоўнага свету, народная жыццёвая мудрасць, а галоўнымі функцыямі ў грамадстве заўсёды былі і застаюцца на сучасным этапе практычная, ідэйна-змястоўная, эстэтычная, абрадавая і выхаваўчая. Прадстаўляючы духоўную цэласнасць ў грамадстве, народнае мастацтва захоўвае ў сабе не толькі выпрацаваныя нашымі папярэднікамі традыцыі, але і акумулюе праявы сучаснага эстэтычнага, вобразна-пластычнага мастацкага асэнсавання рэальнасці. Важнай асаблівасцю народнага мастацтва з'яўляецца тое, што са змяненнем аб'ектыўных жыццёвых рэалій яно захоўвае такія пастаянныя катэгорыі, як прыродную і гістарычную мастацкую свядомасць. Народнае мастацтва як спецыфічны пласт культуры выконвае вялікую ролю духоўнага ўзбагачэння грамадства, маральнага і эстэтычнага развіцця чалавека, фарміравання яго светапоглядных пазіцый на аснове высокіх ідэалаў і агульначалавечых культурных каштоўнасцей, і ў гэтым яго галоўная гістарычнае значэнне. Разам з тым яно не можа абмяжоўвацца толькі прыкладнымі відамі і формамі. Сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя пераўтварэнні стварылі ўмовы для развіцця ўсіх яго формаў і кірункаў. Значна пашырыліся межы творчых праяў народа, у мастацтве народных майстроў з'явіліся новыя вобразы, багацей сталі ўяўленні пра эстэтычнай сутнасці жыццёвых з'яў. Усё гэта кваліфікуе народнае мастацтва не як нязменны, а як дынамічны арганізм у духоўным жыцці грамадства, якое ўзбагачаецца шырокім полем разнавіднасцей творчага працэсу.

ЛІТАРАТУРА

1. **Большой** энциклопедический словарь / гл. ред. А. М. Прохоров. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Большая рос. энцикл. ; СПб. : Норинт, 2004. – 1434 с.

2. **Горький, М.** О литературе / М. Горький. – М. : Совет. писатель, 1953. – 48 с.

3. **Немет, Л.** Изменение функции искусства (о процессе субъективизации) / Л. Немет // Борьба идей в эстетике. Марксистско-ленинская критика реакционных эстетических учений / М. Овсянников [и др.]. – М., 1974. – С. 103–126.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ